**Упраўленне па адукацыі**
**адміністрацыі Маскоўскага раёна г.Брэста**
**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №7 г.Брэста”**

# ТРАДЫЦЫІ ЯКУБА КОЛАСА І НАВАТАРСТВА ІВАНА МЕЛЕЖА Ў КАНТЭКСЦЕ ВОБРАЗАЎ “ЯДВІСЯ – ГАННА”

Мішапуд Уладзіслаў Юр’евіч
XI “Г” клас

Кіраўнік: Коваль Н. М.,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры

**2021 г.**

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ………………………………………………………………….. 3
ГЛАВА І ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА ЯК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫЯ ПАНЯЦЦІ ……………………………………………………………… 5
1.1. Традыцыі і наватарства – дзве тэндэнцыі адзінага літаратурнага працэсу……………………………………………………………................ 5
1.2. Традыцыі Якуба Коласа ў рамане Івана Мележа “Людзі на балоце”………………………………………………………………….. 6
1.3. Наватарства Івана Мележа ў рамане “Людзі на балоце” ………………7
ГЛАВА ІІ ТРАДЫЦЫЙНАЕ І НАВАТАРСКАЕ Ў ВОБРАЗЕ ГАННЫ ЧАРНУШКІ……………………………………………………………….. 8
2.1. Ядвіся і Ганна : коласаўскія традыцыі……………………………….. . 8
2.2. Ядвіся і Ганна : наватарства Івана Мележа……………………………11
ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………….... ……….16
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ……………………………………….17

# УВОДЗІНЫ

Ёсць творы, якія можна перачытваць па некалькі разоў, можна вяртацца да іх , каб яшчэ і яшчэ раз перажываць тое, што перажыта героямі гэтых твораў. Такія творы – вялікі поспех для пісьменніка, сведчанне незвычайнага таленту, творчая ўдача, за якую чакае гарачая ўдзячнасць і прыхільнасць чытача. Да такіх твораў па праву можна аднесці аповесць Якуба Коласа “У палескай глушы” і раман Івана Мележа “Людзі на балоце”. Што ж так вабіць, інтрыгуе чытача ў гэтых творах? Напэўна, тое, што там дзейнічаюць узнёслыя, няўрымслівыя, моцныя духам, здольныя на высокія пачуцці натуры, адным словам, – прыгожыя людзі.

Вучэбнай праграмай па беларускай літаратуры для X класа пры вывучэнні рамана “Людзі на балоце” прадугледжана знаёмства з такімі літаратуразнаўчымі паняццямі, як традыцыі і наватарства. Пры гэтым пра пераемнасць Іванам Мележам традыцый размова вядзецца галоўным чынам у рэчышчы пошуку “слядоў прысутнасці Коласа”, ды і пра наватарства таксама мяркуюць, супастаўляючы коласаўскі і мележаўскі творы. Гэта і падштурхнула мяне да напісання даследчай работы “Традыцыі Якуба Коласа і наватарства Івана Мележа ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна”.

Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што традыцыі і наватарства на ўзроўні вобразаў “Ядвіся (аповесць “У палескай глушы”

Я. Коласа) – Ганна (раман “Людзі на балоце” І. Мележа)”, якія на ўроках толькі павярхоўна акрэсліваюцца , павінны быць вывучаны як мага паўней.

Навізна работы ў тым, што ў літаратуразнаўстве ўвага акцэнтуецца на традыцыйнасці Івана Мележа ў адлюстраванні пэўных рыс палескіх прыгажунь, аднак глыбокага, грунтоўнага аналізу праблемы традыцый і наватарства Івана Мележа ў стварэнні і раскрыцці вобраза Ганны ў супастаўленні з Ядвісяй не рабілася.

**Аб’ект** даследавання: вобразы Ядвісі (аповесць “У палескай глушы”

Я. Коласа) і Ганны (раман “Людзі на балоце” І. Мележа).

**Прадмет** даследавання: традыцыі Коласа і наватарства Івана Мележа ў стварэнні і раскрыцці вобраза Ганны.

**Мэта** даследавання: выявіць своеасаблівасць вобраза Ганны ў параўнанні з вобразам Ядвісі ў святле наследавання літаратурнага вопыту Якуба Коласа і мастацкіх знаходак Івана Мележа.

**Задачы:**

- параўнаць шматграннасць вобраза Ганны з вобразам Ядвісі;
- вызначыць традыцыйнае ў вобразе Ганны і рысы пераемнасці ў параўнанні з вобразам Ядвісі;
- выявіць наватарства І. Мележа пры стварэнні вобраза Ганны.

**Гіпотэза**: можна меркаваць, што ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна” традыцыі Якуба Коласа знайшлі працяг і развіццё ў наватарстве І. Мележа, а іх творчае спалучэнне і мастацкае ўзаемадзеянне “нарадзіла” яркі, запамінальны, непаўторны жаночы вобраз у беларускай літаратуры.

**Метады даследавання;**

1. аналіз вобразаў, вызначэнне характэрных якасцей асобы;
2. параўнанне вобразаў Ядвісі і Ганны, вызначэнне сродкаў і спосабаў стварэння літаратурных герояў;
3. абагульненне і вывады.

**Практычная значнасць** даследавання заключаецца ў тым, што яно дапамагае больш глыбока спасцігнуць праблему традыцый і наватарства ў рамане І.Мележа “Людзі на балоце”, а таму можа быць цікавым і карысным вучням і настаўнікам.

## ГЛАВА I Традыцыі і наватарства як літаратуразнаўчыя паняцці

### 1.1 Традыцыі і наватарства – дзве тэндэнцыі адзінага літаратурнага працэсу

Традыцыі і наватарства – два бакі, дзве ўзаемазвязаныя тэндэнцыі адзінага літаратурнага працэсу. “Традыцыі (ад лац. *traditio* – перадача) – выкарыстанне і развіццё ранейшага літаратурнага вопыту. Гэта своеасаблівы “генетычны код”, з дапамогай якога зберагаецца ідэйна-мастацкі вопыт наступным эпохам і пакаленням. Наватарства ( ад. лац. *novator* – абнавіцель) – абнаўленне і ўзбагачэнне зместу і формы літаратуры новымі мастацкімі дасягненнямі і адкрыццямі” [1, с. 115]. Творчасць кожнага выдатнага пісьменніка нясе ў сабе новыя ідэі, вобразы, новыя думкі аб жыцці, адкрывае яшчэ нязведаныя бакі рэчаіснасці. Разам з тым у ёй выкарыстоўваюцца і новыя спосабы, прыёмы мастацкага адлюстравання жыцця, якія не сустракаліся раней. Сіла і значэнне наватарства залежыць ад таленту пісьменніка, ад шырыні яго кругагляду, прагрэсіўнасці светапогляду, ад мастацкіх традыцый літаратуры, на якія ён абапіраецца. Наватарства ў літаратуры залежыць ад гістарычнага развіцця грамадства, ад тых сацыяльных і іншых зрухаў, перамен, якія адбываюцца ў рэчаіснасці. Менавіта яны і абумоўліваюць новыя якасці ў літаратуры.

Развіццё літаратуры заўсёды грунтуецца на адзінстве традыцый і наватарства. Новае абапіраецца на здабыткі ранейшай літаратурнай творчасці, яно нараджаецца на аснове развіцця. Іншымі словамі, традыцыя знаходзіць сваё развіццё ў наватарстве, наватарства адкрываецца праз традыцыі. Усё перадавое, сапраўды наватарскае ў літаратуры і мастацтве, што выяўляе ўстойлівае ў жыцці, становіцца традыцыяй і ў сваю чаргу служыць момантам для наватарства.

Традыцыя і наватарства – узаемадапаўняльныя велічыні. Гарманічная ўзаемасувязь паміж імі з’яўляецца галоўнай умовай вялікай і плённай літаратурнай творчасці. Развіццё літаратурных працэсаў апошніх двух стагоддзяў паказала, што аднолькава згубным будзе як шлях адмовы ад наватарства і кананізацыя традыцый, так і адмаўленне ад традыцый з вечным пошукам навізны.

## 1.2 Традыцыі Якуба Коласа ў рамане Івана Мележа “Людзі на балоце”

Іван Мележ быў не першы, хто пісаў пра Палессе. Пра яго пісалі пачынальнікі новай беларускай літаратуры Янка Лучына (“Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”) і Максім Гарэцкі (“На этапах”). Але сапраўдным песняром Палесся стаў Якуб Колас. Пасля заканчэння Нясвіжскай семінарыі маладога настаўніка Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча накіроўваюць на працу ў вёску Люсіна. Пазней ён працаваў у Пінкавічах, Лунінцы, Пінску. З Палессем ў Якуба Коласа звязана каля дзесяці гадоў жыцця. Гэты край адыграў выключную ролю ў станаўленні Коласа як педагога, вучонага і пісьменніка. Колас любіў Палессе, і яно знайшло шырокае мастацкае адлюстраванне ў першых дзвюх аповесцях трылогіі “На ростанях” – “У палескай глушы” і “У глыбі Палесся”. Такім чынам, Іван Мележ у рамане “Людзі на балоце” звярнуўся да тэмы, якую можна назваць традыцыйнай у беларускай літаратуры. Традыцыйны гэты раман не толькі па рэгіянальным каларыце, а і па творчым падыходзе аўтара да многіх праблем. Калі гаварыць пра “сляды прысутнасці Коласа”, то яны выяўляюцца ў наступным:

– падабенства жыццёвых сітуацый, у якія трапляюць героі;

– пэўныя рысы характараў, напрыклад, “калючасць” Ядвісі і Ганны, палескіх прыгажунь;

– блізкасць ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі, агульнага падыходу да асэнсавання жыццёвага матэрыялу, да ўзнаўлення плыні жыцця ў мастацкім творы;

– увага да побыту, паўсядзённых клопатаў селяніна, да багацця праяў жыцця: будні, святы, праца, адпачынак, сям’я, сялянская грамада і інш.;

– захапленне маральнымі асновамі сялянскага жыцця, духоўным багаццем вяскоўцаў;

– паэтызацыя чалавека-працаўніка.

Ёсць у рамане І.Мележа “Людзі на балоце” і “сляды прысутнасці” коласаўскага Міхала, героя “Новай зямлі”, якога можна назваць своеасаблівым сваяком Васіля. Іх зблізкае працавітасць, любоў да зямлі, вера, што ў ёй заключаецца шчасце, будучыня, годнае жыццё для сябе і сваіх дзяцей.

Паэтызацыя роднага кута, красы і непаўторнасці прыроды, лірычны струмень, характэрны для абодвух мастакоў слова, услаўленне народных звычаяў і святаў, вера сялян у патаемнае, беражлівыя адносіны да акаляючага асяроддзя праходзяць чырвонай ніткай праз “Новую зямлю”, палескія аповесці Якуба Коласа і першую кнігу “Палескай хронікі” Івана Мележа.

На традыцыйны падыход у “Палескай хроніцы” ўплывалі розныя фактары, але найперш тое, што беларуская літаратура 60-70-ых г.г. характарызавалася павышанай увагай да чалавека ва ўсёй бытавой яго натуральнасці, у багацці народных і нацыянальных фарбаў. Праз жыццё беларуса мастацкая літаратура раскрывае агульначалавечае. Сваім агульначалавечым праламленнем “Палеская хроніка” можа паспрачацца з лепшымі набыткамі сусветнай літаратуры.

### 1.3 Наватарства Івана Мележа ў рамане “Людзі на балоце”

Раман Івана Мележа “Людзі на балоце” быў традыцыйным і наватарскім адначасова. Нягледзячы на тое, што ў творы разглядаецца палеская тэма, чытачамі і прафесійнымі даследчыкамі раман быў успрыняты як адкрыццё Палесся. Для І.Мележа Палессе – яго родны кут. Тут яму ўсё міла, дарага, сагрэта памяццю дзяцінства і юнацтва. Пісьменнік не раз гаварыў, што “зямля гэтая дарагая яго сэрцу, як ніякая іншая” [2, с. 34], што ён хацеў бы, каб чытачы таксама палюбілі гэту зямлю і яе людзей або па крайняй меры – хаця б ведалі пра іх. Чытаючы творы пра сваю малую радзіму, І. Мележ адчуваў, што Палессе ў іх паказваецца звонку, а не знутры, нават у аповесцях Якуба Коласа. У поле зроку гэтага аўтара трапляе толькі тое, што бачыць і дзе знаходзіцца ў гэты час Лабановіч. Палескія краявіды, побыт, характары палешукоў у коласаўскіх аповесцях даюцца вачыма галоўнага героя, які прыехаў працаваць сюды з Міншчыны. Лабановіч з цікавасцю прыглядаецца да гэтага самабытнага кутка Беларусі. Карціны побыту і прыроды, сялянскія характары тут служаць сродкамі раскрыцця вобраза галоўнага героя.

І. Мележ паказаў Палессе сыноўнім вокам, паказаў знутры, здолеў убачыць тое, чаго да яго не бачыў ніхто. Няма такой сферы жыцця селяніна, якая б не раскрывалася на старонках рамана “Людзі на балоце”. У багацці і разнастайнасці паказаў пісьменнік побыт, прыроду, фальклор, мову, норавы, будні і святы палешукоў. З усёй паўнатой і глыбінёй раскрыў пісьменнік і людскія характары. Наватарскі падыход выявіўся і ў тым, што Іван Мележ ніколі ў сваіх творах не падзяляў герояў на станоўчых і адмоўных. Кожнаму з іх імкнуўся пранікнуць глыбока ў душу і знайсці прычыны тых ці іншых паводзінаў герояў, паказаць чалавечае нават у Халімона Глушака. Даследуючы псіхалогію заможнага селяніна, выяўляючы складанасць і супярэчлівасць характару Глушака, пісьменнік, з аднаго боку, спачувае чалавеку, якога час з моцнага гаспадара ператварыў у ахвяру абставін. А з другога – паказаў, што нічога няма вечнага ў жыцці чалавечым, і той, хто лічыў сябе вышэйшым за ўсіх, павінен мецць за нявестку галадранку Ганну.

Па-новаму паглядзець на тое, што было знаёма, знайсці сучаснае асэнсаванне і тлумачэнне многіх жыццёва важных праблем спрыяў і дух часу, калі Іван Мележ працаваў над раманам “Людзі на балоце”. У творы знайшлі адлюстраванне тыя сацыяльныя і маральныя ўяўленні, па якіх, думалася, будзе ладзіцца жыццё ў СССР. Наватарства мастака выявілася і ў тым, што засяродзіўся ён на драматызме для сялянства паспешлівай і гвалтоўнай калектывізацыі. Тэму калектывізацыі Іван Мележ адлюстраваў з дыстанцыі часу і ў атмасферы ХХ з’езда партыі.

Таленавітае спалучэнне традыцый і наватарства “нарадзіла” сапраўдны мастацкі шэдэўр – раман “Людзі на балоце”. Твор з’яўляецца яскравым прыкладам таго, як традыцыі знаходзяць сваё развіццё ў наватарстве, а наватарства адкрываецца праз традыцыі.

## ГЛАВА II Традыцыйнае і наватарскае ў вобразе Ганны Чарнушкі

### 2.1 Ядвіся і Ганна : коласаўскія традыцыі

Вобразы коласаўскай Ядвісі і мележаўскай Ганны ўваходзяць у галерэю лепшых жаночых вобразаў у беларускай літаратуры. Ядвіся – літаратурны папярэднік Ганны. Іван Мележ, ствараючы і раскрываючы вобраз Ганны, не мог не выкарыстаць творчыя адкрыцці, мастацкія і эстэтычныя набыткі Якуба Коласа. Прыгледзімся да Ганны Чарнушкі, гэтай куранёўскай красуні і ганарліўкі, і паспрабуем высветліць, што пераняў, што наследаваў Іван Мележ у Якуба Коласа ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна”.

І Ядвісю, і Ганну ўпершыню сустракаем у чароўным, але глухім кутку беларускага Палесся, які багнамі і гушчарамі, здаецца, адасоблены ад усяго свету: вёска Цельшына стаяла на невялічкай палянцы сярод лесу і хмызнякоў, “густыя сцены пушчы адусюль націскалі на гэту вёску, насядалі з пагрозай” [3, с. 25], а вёска Курані прытулілася на востраве (праўда, аб яго не плёскаліся ні марскія, ні азёрныя хвалі) сярод куп’істай дрыгвы і панурых лясоў, “большую частку года востраў быў як бы адасоблены ад іншых вёсак і мястэчак” [4, с. 15]. Менавіта тут, сярод дзікай прыроды, заружавелі дзве прыгожыя дзяўчыны-кветкі. Падабенства месцаў пражывання абедзвюх гераінь дае падставы бачыць у гэтым “сляды Коласа”.

Прасочваюцца “сляды Коласа” і ў тым, што ў Ганне, як і ў Ядвісі, прываблівае найперш дзявочае хараство, вонкавая прыгажосць, што і пацвярджае апісанне знешняга выгляду гераінь у абодвух творах. У партрэтнай характарыстыцы Іван Мележ услед за Якубам Коласам засяроджвае ўвагу на такой дэталі, як вочы. У абодвух пісьменнікаў вочы з’яўляюцца адлюстраваннем ўнутранага, духоўнага свету: у вачах Ядвісі то іскрыўся вясёлы смех, то адбівалася засмучэнне і сталасць, то вочы бліскалі гневам; вочы Ганны ніколі не былі абыякавыя, нудлівыя, яны то бліскалі весялосцю, то гарэлі насмешкаю і недавер’ем; гарачыя, поўныя нянавісці, дзікаватыя і непакорныя – у сутычках з Яўхімам.

“Коласаўскія сляды” прасочваюцца і ў тым, што страта самага блізкага і дарагога чалавека – маці – лягла ў душы гераінь непазбыўным і нясцерпным цяжарам, але разам з тым садзейнічала фарміраванню і абвастрэнню такіх якасцей характару, як дабрыня, спагадлівасць, чуласць, ласкавасць, міласэрнасць. Іх хараство менавіта ў здольнасці чуйна адклікацца на чужую бяду, чужы боль, здольнасці паспагадаць, падтрымаць у цяжкую хвіліну. Абдзеленыя жаночай, мацярынскай ласкай, пяшчотай і клапатлівасцю, Ядвіся і Ганна шчодра дораць іх іншым, не патрабуючы нічога ўзамен, інстыктыўна цягнуцца да тых, хто валодае гэтымі якасцямі: Ядвіся – да бабкі Мар’і, Ганна – да бацькі. Сямейнымі абставінамі можна патлумачыць і тое, што Ядвіся і Ганна былі не па ўзросту сур’ёзнымі, разважлівымі, разумнымі і сталымі, што выяўлялася ў цвёрдым поглядзе на жыццё, самастойнасці ацэнак і меркаванняў, наяўнасці ўласных ідэалаў і перакананняў.

Традыцыі Якуба Коласа бачым і ў некаторых рысах характару мележаўскай Ганны. Галоўная і вызначальная з іх – гэта калючасць. Ядвіся,

разглядаючы грушу, якую пасадзіў на памяць аб ёй Лабановіч, ці то сур'ёзна, ці то жартам сказала, што вырве і выкіне яе, бо груша такая ж дзікая і калючая, як і яна сама. Найвыразней калючасць і Ганны, і Ядвісі выяўляецца ў параўнанні з кустом шыпшыны, на якім красуюць прыгожыя і пахучыя кветкі. Яны вабяць, прынаджваюць, падкупляюць сваім хараством. Але як лёгка падмануцца, ашукацца! Працягнеш руку сарваць такую кветку – і адразу адхопіш, бы апёкся. Знешняя прыгажосць падманлівая, а для таго, каб яна не была безабароннай і даступнай, ёсць калючкі. Так і Ганна з Ядвісяй: такія прынадныя і прывабныя, здаецца, стрыманыя, ураўнаважаныя, рахманыя, памяркоўныя, калі іх не злаваць, не чапаць, не гнявіць, а паспрабуй іх закрануць – то яны ўміг трацяць сваю роўнасць, становяцца небяспечнымі і калючымі. Напэўна, іх калючасць – гэта спосаб абароны ад злых, крывадушных, хцівых, жорсткіх людзей.

Дзявочы гонар і цнатлівасць – для Ганны і Ядвісі найвялікшыя каштоўнасці, якія неабходна берагчы і шанаваць, страціць іх – гэта раўназначна смерці, гэта самая вялікая ганьба. Дзяўчаты вылучаюцца высокаразвітым пачуццём чалавечай годнасці і гордасці, заўсёды дбаюць, каб не прынізіць сябе, каб не ўраніць свой гонар, патрабуюць ад другіх паважлівых да сябе адносін.

І Ядвіся, і Ганна былі надзелены прыроднай здольнасцю пажартаваць, гарэзлівасцю, дасціпнасцю. Здавалася,што Ядвіся заўсёды была ў добрым настроі і ў кампаніі здзіўляла прысутных сваёй весялосцю. Ніколі не здаралася, каб на жарт яна не адказала жартам. Вострага язычка Ганны пабойвалася ўся куранёўская моладзь. Асабліва даставалася Яўхіму, які нярэдка імкнууся прынізіць дзяўчыну, сказаць што-небудзь абразлівае. Мележ ухваляе Ганніна красамоўства, яе дакладныя, тонкія і едкія ацэнкі.

Ядвіся і Ганна былі не па ўзросту сур'ёзнымі, разважлівымі, сталымі, што выяўлялася ў цвёрдым поглядзе на жыццё, самастойнасці ацэнак і меркаванняў, наяўнасці ўласных ідэалаў і перакананняў.

Каханне Ядвісі да Лабановіча , каханне Ганны да Васіля і выпрабаванне каханнем – яшчэ адзін "след коласаўскай прысутнасці" ў кантэксце вобразаў "Ядвіся – Ганна". У ім, каханні, найвыразней і найпаўней раскрываюцца душэўная чысціня, маральная высакароднасць, прамяністая жаноцкасць гэтых гераінь. Абедзвюм наканавана зведаць радасць і боль, шчасце і горыч першага, юнацкага, нясмелага, трапяткога, а таму нетрывалага і крохкага кахання. Яно прыйшло нечакана і раптоўна, але яго прадчуваннем поўніліся істоты дзяўчат. У свае шаснаццаць год Ядвіся ўпадабала маладога настаўніка Лабановіча. Яна даўно песціла мару і надзею на шчасце і, хоць баялася памыліцца, бо ўжо зразумела, што ў жыцці многа злога, дрэннага, жорсткага, усё ж такі сама рабіла рашучыя крокі насустрач свайму каханню: прынесла свайму суседу кветкі, запрашала прагуляцца, пісала запіскі, першая пацалавала свайго выбранніка. Сілай і страсцю свайго кахання не можа не захапляць і сямнаццацігадовая Ганна. Яна, як і Ядвіся, бярэ ініцыятыву ў свае рукі: насуперак куранёўскім звычаям смела і лішне не разважаючы робіць крокі насустрач Васілю ў каханні: сама выклікае яго на прызнанне ля шапаткіх грушаў, абараняе перад непрыступным міліцыянерам Шабетам, кідаецца да

хлопца на вачах усёй вёскі, калі таго вядуць у юравіцкую турму, хоць дзяўчыне і нялёгка пайсці на такое пры ўсіх аднавяскоўцах.

У своеасаблівым каханні герояў Я.Коласа і І.Мележа было ўсё: трапяткая надзея на ўзаемнасць, радасць сустрэч, рэўнасць, шчасце прызнання і першага пацалунка, імкненне адпомсціць адзін аднаму, боль непаразуменняў (а іх было якраз надзвычай многа!). І галоўнае – каханню маладых людзей не суджана было здзейсніцца.

Такім чынам, вышэй адзначанае дае падставы сцвярджаць, што ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна” традыцыйнасць больш мнагалучная і шырокая, чым прынята лічыць. Гэта не збядняе вобраз Ганны, а, наадварот, адкрывае шляхі для пошуку новага.

## 2.2 Ядвіся і Ганна: наватарства Івана Мележа

Дасканалае адчуванне рухаў жаночай душы прыйшло да Івана Мележа не адразу. Маючы ўзоры стварэння запамінальных вобразаў палескіх жанчын такімі майстрамі слова, як Якуб Колас (“На ростанях”), Аляксандр Купрын (“Алеся”) і інш., пісьменнік, сапраўдны знаўца людзей свайго краю, падступаўся да жаночых вобразаў яшчэ ў першых творах. Жыццёвы матэрыял у “Палескай хроніцы” ўвасобіўся ў непаўторных вобразах дзяўчат і жанок з глыбіні прыпяцкага Палесся: Хадоська, Дзятліха, Дамеціха, Глушачыха, Куліна, Сарока і інш. І канечне ж – Ганна. Сярод жаночых вобразаў яна стаіць асобна. Вясковая прыгажуня не толькі ўвасабленне зграбнасці і маладосці, прадмет увагі куранёўскі хлопцаў, але і тая нітачка, што звязвае многія сюжэтныя лініі, эпіцэнтр духоўнага напружання ў развіцці дзеяння. Паспрабуем высветліць, узяўшы за ўзор коласаўскую Ядвісю, як абнавіў, чым узбагаціў вобраз палескай дзяўчыны Іван Мележ.

Многія героі “Палескай хронікі” маюць сваіх прататыпаў. Але Ганна, па прызнанні Івана Мележа , цалкам “ выдумана”.

І Іван Мележ, і Якуб Колас, несумненна, майстры партрэтнай характарыстыкі. Усхвалявана, шчыра, лірычна напісаны партрэт Ганны ў сцэне разгорнутага параўнання яе з рабінай. Дзяўчына падаецца пісьменнікам на фоне квітнеючай палескай прыроды, у параўнанні з ёй. Вонкавая прыгажосць Ганны нікога не пакідае раўнадушным і абыякавым, нават прыдзіры і зайздросніцы з жанок згаджаюцца з тым, што Чарнушкава дачка першая красуня не толькі ў вёсцы, але і ва ўсёй ваколіцы. Чароўнае, дзівоснае аблічча куранёўскай прыгажуні запамінаецца чытачу, западае ў душу адразу і надоўга: ”…Дачка ва ўсім выйшла ў матку. З аблічча – дык як вылітая: і невялікая ростам, і не гладкая – худая, можна сказаць, і плечы, як у маткі, вузкія, і рукі тонкія. І косы чорныя, густыя, аж блішчаць, бы намочаныя, і смуглявасць на твары такая ж, і шчокі таксама яе выпінаюцца… Ганну ніяк нельга было палічыць за кволую: збоку, з аднаго позірку відаць было – крамяная у Цімоха дзяўчына, дужая, сілаю ўся налілася! Вунь якая пругкасць у хадзе, спрытная якая ў рухах, так і відаць – маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!...” [4, с. 36] І да ўсяго гэтага – цудоўныя вільготна-цёмныя, падобныя на спелыя вішні, вочы, якія ўвесь час блішчэлі, ззялі, гарэлі, якія нешта таілі: то няўціхнае хваляванне, то весялосць, то недавер і насмешку.

Не менш чароўны і прывабны партрэт Ядвісі. Вачыма Лабановіча першы раз бачым старэйшую дачку пана падлоўчага: “Габрыня зараз жа выйшла і хутка вярнулася з сястрой, стройнаю чарняваю дзяўчынаю, гадоў шаснаццаці, з тонкімі, прыгожа абрысаванымі брывамі. Выраз яе чорных акруглых вачэй часта змяняўся: то ў іх іскрыўся вясёлы смех і нахіл да жартаўлівасці, то адбівалася нейкае засмучэнне і такая сталасць, што рабіла ўражанне, быццам дзяўчына многа перажыла і перадумала” [3, с. 52]. Смугламу твару вельмі пасавалі пышныя цёмна-каштанавыя раскошныя валасы, якімі неаднойчы любаваўся Лабановіч і якія Ядвісі прыносілі смутак, бо напаміналі ёй аб маці.

Па-наватарску падышоў Іван Мележ да апісання знешнасці Ганны: па-першае, выкарыстаў такі сінтаксічна-кампазіцыйны прыём, як паралелізм (рабіна – Ганна); па-другое, стварыў такую партрэтную характарыстыку, якая сведчыць, што Ганна і Ядвіся хоць і прыгожыя, але прыгожыя па-рознаму, кожная па-свойму: Ганніна прыгажосць кідкая, задзірыстая, заўважаецца з першага погляду, каля такой нельга прайсці міма, не спыніўшыся ў захапленні і здзіўленні; Ядвісіна ж стрыманая, нават сарамлівая, стоеная, як бы прыхаваная ад людскіх вачэй і адкрываецца не кожнаму, уражвае не адразу, а толькі пры больш блізкім знаёмстве.

Іван Мележ, які клапаціўся пра ўзбагачэнне літаратуры новымі вобразамі, у адрозненне ад Якуба Коласа зрабіў галоўнай гераіняй свайго твора простую сялянскую дзяўчыну. Школу і навуку ёй замяніла цяжкая, але такая неабходная праца. Гэта ніяк не збядняе вобраз Ганны, а, наадварот, узвышае яго. Працавітасць дзяўчыны кампенсуе адсутнасць элементарных ведаў. Іван Мележ (а разам з ім і мы) любуецца ёю, калі яна завіхаецца ў хаце па гаспадарцы, калі дапамагае гаротніку-бацьку ў гумне, калі да стомы працуе на Глушака на малацьбе. Добра ведала Ганна, што “работа – гэта не цешыцца, не радавацца”, таму і працавала без скаргаў і нараканняў. Ганна з іншага, чым Ядвіся, сацыяльнага асяроддзя. Ядвіся з інтэлігентнай сям’і, дзе надзвычай высока цэняцца выхаванасць і адукаванасць. У сям’і пана падлоўчага былі створаны спрыяльныя ўмовы для пашырэння кругагляду, развіцця інтэлекту, выпрацоўкі высокай культуры паводзін. Ядвіся не траціць дарма часу, шмат і ўдумліва чытае, разважае над прачытаным, імкнецца праверыць праўдзівасць літаратуры ўласным вопытам ці вопытам знаёмых ёй людзей. У яе добры эстэтычны густ і вакальныя здольнасці. Яна з задавальненнем слухае музыку.

Наватарства Івана Мележа ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна” назіраецца і ў тым, што, адлюстроўваючы жыццёвыя ідэалы Ганны і яе погляды на жыццё ўвогуле, пісьменнік ішоў шляхам рэалізму, а жыццёвыя ідэалы і погляды на жыццё коласаўскай Ядвісі раскрыты з пазіцыі рамантызму. У мележаўскай гераіні жыццёвы ідэал вельмі просты: быць разам з каханым чалавекам, дзяліць з ім радасці і нягоды, адчуць усю асалоду сямейнага шчасця. Здаецца, усё так проста і так мала патрэбна чалавеку, каб жыццё было напоўнена сэнсам і не страціла сваёй прывабнасці. У Ядвісі даўно быў намер паехаць з Цельшына, вырвацца з дома-турмы, яна жыла прагай іншага, больш змястоўнага і цікавага, поўнага глыбокага сэнсу жыцця, верыла, што дзесьці далёка ёсць такое жыццё. Ядвіся многа думала пра тое невядомае жыццё, але яе думкі былі такія ,”што бываюць і ў нявольніка за мураванымі сценамі, якому так прынадна ўсміхаецца воля. Розніца толькі ў тым, што гэта воля добра вядома яму, тады як жыццё за межамі гэтых панурых лясоў і зацятых у сваёй маўклівасці балот было для Ядвісі яшчэ не зусім ясным, стала быць, яшчэ больш прывабным і прыгожым” [3, с. 95]. Яна імкнецца знайсці такое месца ў жыцці, якое варта чалавека.

Ганна Чарнушка, якая з дзяцінства зведала цану кавалка хлеба, зразумела, як цяжка жыць беднаму чалавеку, глядзіць, бачыць, прымае жыццё такім, якое

яно ёсць на самой справе, у яе няма ніякіх ілюзій наконт падарункаў лёсу. Ядвіся мяркуе пра жыццё толькі зыходзячы з сямейнай драмы – смерці маці і нешчаслівага замужжа мачахі, а астатняе ёй невядома, таму і ўяўляецца ёй ад’езд з Цельшына, з бацькоўскай хаты выхадам, збаўленнем. Але збаўленнем ад чаго? Ад жыцця? Дык ад яго нікуды не ўцячы і не схавацца.

Будучы пісьменнікам, які ішоў у літаратуры сваім адметным шляхам, Іван Мележ сюжэтную лінію кахання Ганны і Васіля напоўніў новым зместам, які прынцыпова адрознівае каханне Ядвісі і Лабановіча і ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна” ўспрымаецца як наватарства. Чаму Ганна выбрала Васіля, а Ядвіся – Лабановіча? За Ганну выбар зрабіла сэрца, і чаму яно выбрала Васіля, гэтага панурага маўклівага хлопца, цяжка (а можа нават і немагчыма!) растлумачыць. Пачуццё ўзнікла – і Ганна адчайна кінулася ў вір гэтага пачуцця, не хаваючы і не тоячы сваёй прыхільнасці да Васіля, адкрыта змагаючыся за сваё шчасце. Ядвіся ж сваё сэрца аддала Лабановічу, бо ён быў не падобны да людзей, што былі навокал яе: ён для Ядвісі быў адтуль, з далёкіх невядомых прастораў. Каханне да настаўніка з’явілася для яе адкрыццём новага свету, неразгаданых, але прываблівых чараў будучыні.

Каханне Ганны і каханне Ядвісі не здзейснілася. Чаму? Па розных прычынах. У выпадку з Ганнай не апошнюю ролю адыграў любоўны трохкутнік. Ва ўзаемаадносіны Ганны і Васіля груба і цынічна ўмешваецца куранёўскі багацей Яўхім, самалюбства якога не можа змірыцца з Ганнінай абыякавасцю і непрыхільнасцю. Вось і даводзіцца Ганне весці змаганне з дурным каханнем маладога Карча, які вырашыў яшчэ раз пераканацца ў тым, што ён неадхільны кавалер, дамогшыся сімпатыі “зрэбнай каралевы”. Не дабіўшыся поспеху лёгкімі заляцаннямі, Корч вырашае ўзяць прыгажуню сілай. Але Ганна не з тых , каго можна лёгка зламаць, прынізіць і прымусіць падпарадкавацца, яна з тых, хто годна абараняе свой дзявочы гонар. Пасля гэтай няўдачы дзяўчына стала для Яўхіма яшчэ больш жаданай, і ён вырашае ажаніцца з ёю. Нельга не лічыцца з тым, што Ганна – дачка свайго часу, таму ў змаганні з чуткамі, нагаворамі ды і з самой сабою яна не адважваецца зрабіць адкрыты выклік звычаю і вырашае пайсці за Яўхіма, бо на карту пастаўлена не толькі яе добрае імя, але і спакойная старасць бацькі, дабрабыт і гонар сям’і (мачыха ведала, якія струны закрануць, калі ўгаворвала падчарку на шлюб). Да таго ж дасягнута пагадненне: дзяўчына выставіла Карчу ўльтыматум – “па-добраму кеб” [4, с. 115], а інакш не бачыць яму “зрэбнай каралевы”. Ды і не было ўпэўненасці ў тым, што прыйдзе той, каго кахала: сэрца падказвала, што яму патрэбна іншая жонка, а не Ганна-беспасажніца.

Героі Коласа жывуць у перыяд выключнай грамадскай актыўнасці. Павевы часу кранаюць і іх. Цельшынскі настаўнік імкнецца перш за ўсё стаць грамадзянінам. Магчыма, далейшы шлях з Ядвісяй уяўляўся яму перашкодай на шляху здзяйснення сваіх запаветных мар. У каханні Лабановіч аказаўся нерашучым і вартым жалю. Адчуваючы нерашучасць выбранніка, баючыся таксама, што з часам яе герой можа стаць такім, як і ўсе мужчыны ў вёсцы, Ядвіся пакідае Цельшына: яна сама так захацела. Яна проста спыніла сваё

шчасце і сказала: “Даволі! Няхай лепш шчасце будзе недапітым, бо, можа, на дне яго наліта атрута. Так лепей!” [3, с. 175]. Сумна гучаць апошнія радкі аповесці, яны нібы песня аб страчаным каханні.

З аднаго боку, коласаўская Ядвіся і мележаўская Ганна багата чым падобныя, паміж імі шмат агульнага, з другога боку, кожная з іх надзелена адметнымі якасцямі і ўласцівасцямі, якія і адрозніваюць іх, робяць па-свойму непаўторнымі, абаяльнымі і да канца неразгаданымі. Іван Мележ паказаў Ганну натурай цэльнай, надзіва моцнай і жыццядзейнай. Стойкая, вынослівая, загартаваная, яна не схіляецца перад жыццёвымі выпрабаваннямі і нягодамі, пераадольвае іх з уласцівай толькі ёй напорыстасцю і нязломнасцю. Ганна часта прымае паспешныя, імгненныя рашэнні, добра не ўзважыўшы ўсе “за” і “супраць”, не клапоцячыся пра іх вынікі. Ганна жыве сэрцам, яму давярае, да яго прыслухоўваецца. І няхай яна памыляецца, няхай не заўсёды дзейнічае разумна, але разлік і карыслівасць ніколі не кіруюць яе ўчынкамі.

Не крыўдзіць і не зневажаць, не жадаць зла і не зайздросціць, дбаць не толькі пра сябе, але і пра іншых, з усіх выпрабаванняў выходзіць чалавекам, не загубіць чужога жыцця, заўсёды быць справядлівай і праўдзівай – вось тыя высокія маральныя катэгорыі, якімі з усёй непасрэднасцю, шчырасцю кіруецца палеская прыгажуня – мележаўская Ганна.

Ядвіся ў параўнанні з Ганнай больш кволая, слабая, ранімая, мяккая. Апыніся Ядвіся ў той самай сітуацыі, што і куранёўская прыгажуня, невядома, ці знайшла б яна ў сабе сілы спрацьстаяць нахабству і напорству Яўхіма. Ядвіся ў большай ступені разважлівая, чым Ганна: перш чым ажыццявіць які-небудзь замысел, яна вагаецца, пакутліва думае, а затым здзяйсняе.

Замкнёнасць, утоенасць, супярэчлівасць – вызначальныя ўласцівасці характару Ядвісі. Якуб Колас параўноўвае Ядвісю то з дзікай птушкай, то з сарнай, то з цудоўнай краскай Палесся, то з найпрыгажэйшай казкай гэтага кутка Беларусі, то з нявольнікам за мураванымі сценамі. Гэтыя параўнанні дапамагаюць адчуць незвычайную чароўнасць, таемнасць і загадкавасць натуры, энергію і рухавасць не толькі знешняга, але і ўнутранага жыцця дзяўчыны, яе свабодалюбства, парыў на волю, а таксама духоўную няволю, атмасферу цяжару, які панаваў у доме пана падлоўчага і які вельмі балюча ўспрымала Ядвіся. Пры ўсёй мяккасці натуры і непасрэднасці ў выяўленні сваіх пачуццяў дзяўчына цалкам нікому не можа даверыцца. Яна часта забягала да бабкі Мар’і, адчуваючы добрае сэрца старожкі. Гэтай паляшучцы Ядвіся сёе-тое адкрывала. Але і ў размовах з бабкаю яна часта сур’ёзную гаворку зводзіла на жарт ці пераконвала старожку, што тая яе дрэнна зразумела. Асабліва выразна супярэчлівасць натуры Ядвісі выявілася ў сцэне, калі дзяўчына была злоўлена Лабановічам у яго пакоі, дзе пакінула запіску-прызнанне, а затым забрала яе. З аднаго боку, тэкст запіскі (“мілы…дурань”), поўныя нянавісці словы: “Усе, усе вы такія гэрады, тэраны!”, злосна кінутае: “Дурань!”, з другога - моцны пацалунак, запрашэнне прагуляцца, ласкавы погляд і ўсмешка. У супярэчлівасці натуры Ядвісі ёсць вытлумачэнне: дзяўчына баіцца памыліцца ў людзях, бо добра ведае, што сапраўдную сваю сутнасць і вартасць чалавек

можа паказаць не адразу, бацька вунь часамі таксама добры і лагодны, а іншы раз ператвараецца ў звера. Вось і суіснуюць у душы Ядвісі супярэчлівыя пачуцці, ад якіх яна пакутуе, але і пазбавіцца не можа.

Акрамя Ядвісі і Ганны ў аповесці Я. Коласа “У палескай глушы” і ў рамане І. Мележа “Людзі на балоце”, дзейнічаюць і іншыя гераіні: панна Марына, панна Людміла, пісаранкі – у першым творы, Хадоська – у другім. Своеасаблівымі паказаў Іван Мележ узаемадачыненні Хадоські і Ганны. Калі ў пачатку твора дзяўчаты – шчырыя сяброўкі, то з развіццём дзеяння становяцца ўсё больш непадобныя адна на адну. Першая – пяшчотная, пакорлівая, ласкавая, другая – незалежная і ганарлівая. Першая пакутліва плыве па цячэнні, другая змагаецца з гаротнай доляй, з неспрыяльнымі абставінамі за права распараджацца сваім жыццём. Вобразы Хадоські і Ганны – грані вобраза-тыпа Жанчыны-маці, Жанчыны-пакутніцы, Жанчыны-працаўніцы, Жанчыны ў вялікім і поўным сэнсе гэтага слова. Пранікліва асэнсоўваючы паралельна з Ганнай складаны, часам супярэчлівы характар Хадоські-Канапляначкі, раманіст не аддае перавагу Ганне, не ставіць яе вышэй за Хадоську, ён сцвярджае права кожнай гераіні быць самой сабою. Гераіні не ўзаемавыключаюць адна другую, а ўзаемадапаўняюць. З сімпатыяй ставіцца І.Мележ як да Ганны, так і да Хадоські, любуецца і захапляецца імі. І ў гэтым – наватарства пісьменніка.

Якуб Колас у аповесці “У палескай глушы” “зводзіць” Андрэя Лабановіча з прадстаўніцамі супрацьлеглага полу. Якую ж ролю яны адыгрываюць? Па-першае, усе яны (і нават Ядвіся) быццам існуюць не самі па сабе, а для характарыстыкі духоўных запатрабаванняў Лабановіча, у нейкай ступені служаць іх мерай. Па-другое, рознасць паміж дзяўчатамі пісьменнік падкрэсліваў праз бачанне галоўнага героя, здольнага крытычна ацаніць жанчыну нават тады, калі сэрца палонена ёю. Па-трэцяе, на пачатку знаёмства з дзяўчынай Лабановіч падпарадкоўваецца агульнапрынятаму стэрэатыпу прыгажосці, што даказваюць наступныя радкі: “А раз у дачку каморніка ўсе закаханы, то яна, без спрэчкі, ёсць верх хараства” [3, с.54]. Па-чацвёртае, пры шанаванні знешняга хараства панны Марыны і панны Людмілы усё ж і Якуб Колас, і яго герой аддаюць перавагу духоўнаму багаццю і духоўнай прыгажосці Ядвісі: “І само сабой напрашалася параўнанне гэтых дзяўчат. Панна Марына, без спрэчкі, мела перавагу над Ядвісяю ў хараstве, але разам з гэтым уступала Ядвісі ў разнастайнасці праяўленняў жыцця… Адлучыўшы ад Марыны хараство, гэтую дзявочую шыльду, ад яе засталося б мала, тады як Ядвіся была натура больш мнагалучная, больш жывая…” [3, с. 69].

Выяўленыя грані наватарства Мележа ў кантэксце вобразаў “Ядвіся – Ганна” яскрава сведчаць, што мележаўская Ганна – гэта не паўтарэнне і не копія коласаўскай Ядвісі, а арыгінальны і самабытны вобраз-тып у беларускай літаратуры.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Традыцыі і наватарства – бінарныя паняцці-тэрміны – выяўляюць складаныя суадносіны ў літаратурным працэсе паміж тым новым, што ўзнікае, і тым, што, будучы ў свой час здабытым, выпрацаваным, наследуецца, працягваецца. Кансервацыя традыцый і культ самадастатковага наватарства аказваюць згубны ўплыў на мастацкую творчасць. Раман “Людзі на балоце” – узор гарманічнай узаемасувязі, гарманічнага ўзаемадзеяння традыцый і наватарства. Традыцыі Якуба Коласа арганічна ўвайшлі ў твор Івана Мележа, даўшы вялікія магчымасці для адкрыцці новага ў жыцці, для глыбокага пазнання яго заканамернасцей, для стварэння такіх мастацкіх каштоўнасцей, якія ўзбагачаюць нацыянальную і агульначалавечую культуру.

У працэсе даследавання, паказваючы шматграннасць узаемадачыненняў вобраза Ганны з вобразам Ядвісі зроблены наступныя вывады:

1. І.Мележ стварыў арыгінальны вобраз-тып беларускай жанчыны ў літаратуры, шматграннасць якога шырэйшая за вобраз Ядвісі.

2. У стварэнні вобраза Ганны І.Мележ пераняў традыцыі Я.Коласа: падабенства месцаў пражывання; дзявочае хараство, страта самага блізкага і дарагога чалавека – маці; падабенства некаторых рысаў характару Ядвісі і Ганны; выпрабаванне каханнем.

3. Мележаўская Ганна – гэта не паўтарэнне і не копія коласаўскай Ядвісі, а арыгінальны і самабытны вобраз-тып у беларускай літаратуры.

“Паглядзіце на дуб вясной, – пісаў Віктор Гюго, – стагадовы ствол, старыя карані, старыя галіны, зялёнае лісце, свежае і маладое. Традыцыя і навізна: традыцыя, якая ўтварае навізну; навізна, якая ўзнікае з традыцыі, – у гэтым усё”. Традыцыя і наватарства ў пэўным сэнсе тоесныя, аднародныя, узаемапранікаюць і пераходзяць адно ў другое.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Ялынцава, І. У. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў для школьнікаў / І. У. Ялынцава. – Мінск: Беларус. асац. “Конкурс”, 2012. – 144 с.
2. Гніламёдаў, У. Іван Мележ: Нарыс жыцця і творчасці / У. Гніламёдаў. – Мінск: Нар. асвета, 1984. – 128 с.
3. Колас, Я. На ростанях. Трылогія / Я. Колас. – Мінск: Юнацтва, 1982. – 502 с.
4. Мележ, І. Людзі на балоце / І. Мележ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. – 400 с.